# Моладзі — пра Радзіму




Дацэнт БДУКМ Аляксандр Вавілаў і студэнты 2 курса факультэта мастацкай культуры БДУКМ Ганна Пшэйнік і Вадзім Пазняк

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў — прызнаная кузня талентаў, дзе гадуюць не проста прафесіяналаў, а патрыятычных творчых асоб. Дзеля гэтага ўдзельнічаюць у адмысловых мерапрыемствах, над якімі разам працуюць выкладчыкі і студэнты.**

Да прыкладу, традыцыйна 9 Мая Прэзідэнт Беларусі ўскладае кветкі да Абеліска Перамогі. Пасля рытуалу адбываецца невялікае тэатралізаванае дзеянне. Арганізацыяй гэтага пастановачнага элемента сёлета займаецца БДУКМ.

— Наша каманда складаецца з 16 чалавек. Вучні прапанавалі ідэю, якая мне адразу спадабалася. Задума набыла сцэнарныя і музычныя контуры. Каб падрыхтаваць усё найлепшым чынам, рэпетавалі ў лёгкаатлетычным манежы і непасрэдна на плошчы, — распавядае мастацкі кіраўнік праекта, дацэнт БДУКМ Аляксандр Вавілаў.

— Аляксандр Дзмітрыевіч дае нам велізарнае поле для дзейнасці. Стварыць дынамічную і прыгожую інсцэніроўку няпроста. Да таго ж я з'яўляюся яшчэ і артысткай. Але гэта надзвычай цікава — паўдзельнічаць у такіх маштабных праектах дзяржаўнага ўзроўню! — дадае студэнтка БДУКМ Ганна Пшэйнік.

Яшчэ адзін важны праект, які рыхтуе Універсітэт культуры да 80-годдзя вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — спектакль "Трохкутнік надзеі". Рэжысёр Аляксандр Вавілаў атрымаў Грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне культуры на ажыццяўленне праекта. Твор унікальны і заснаваны на гісторыях 16 вучняў дацэнта. У пастаноўцы яны задаюцца глабальнымі пытаннямі: ці ёсць будучыня без мінулага і як гістарычная памяць уплывае на нас?

— Паказ запланаваны на апошні дзень мая. Мы прадставім вынік калектыўнай творчасці. Усё прапрацоўваецца да дробязей: святло, гук, музыка, касцюмы, харэаграфія. Хацелі б паказаць пастаноўку не толькі ў Мінску, але і ў мястэчках, адкуль родам мае вучні. Хоць яны плануюць стаць рэжысёрамі, цяпер працуюць і ў якасці акцёраў. Мы закранулі важныя эмацыйныя струны. А як інакш моладзі расказаць, што такое боль, сумленнасць, сяброўства, каханне, Радзіма? — задае рытарычнае пытанне Аляксандр Вавілаў.

— У пастаноўцы мы такія ж студэнты, як і ў жыцці. Прызнацца, іграць сябе — складана. На першай чытцы мы нават плакалі. Ёсць момант, калі атрымліваем лісты з мінулага. Гэтыя пасланні вельмі асабістыя, бо іх напісаў наш настаўнік Аляксандр Дзмітрыевіч, — раскрывае асаблівасці праекта студэнт БДУКМ Вадзім Пазняк.

Таксама ў працоўным календары выкладчыкаў і навучэнцаў — падрыхтоўка да Дня Незалежнасці. Сёлета ў канцы парада плануецца тэатралізаванае шэсце моладзі. Упершыню за яго арганізацыю адказвае Універсітэт культуры. Рэжысёры, іх асістэнты, музыканты, танцоры — каля 2000 чалавек ствараць атмасферу ўрачыстасці на вуліцах горада.

— Тэма — 80 пераможных гадоў. Кожнае дзесяцігоддзе набыло бачную форму, і наша задача расказаць пра іх коратка, праз музыку. Мы абавязаны ўкласціся ў 20 хвілін, — распавядае Аляксандр Вавілаў. — Як паказаць, з чаго пачыналася мінскае метро ці моц нашых гігантаў тыпу БелАЗа? Мяркуецца, што ўпершыню будуць прадстаўлены трактар і камбайн, якія не кіруюцца людзьмі. Раней ніколі з такім не сутыкаўся, але абавязаны ўявіць, як усё будзе выглядаць. Гэтыя пытанні вырашае велізарная крэатыўная каманда студэнтаў і педагогаў. Упэўнены: атрымаецца годна. Спадзяёмся на добрае надвор'е і падтрымку публікі.

**Настасся ЮРКЕВІЧ**
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА